АЛЯКСЕЙ ПЯТКЕВІЧ

Хлапчукі ваенных гадоў

Немцы прыйшлі тады, летам 41-га, досыць нечакана. Хаця ўсе ўжо ведалі, што ідзе вайна, што Саветы адыходзяць. Але каб так хутка… Мы, падшыванцы гадоў сямі-трынаццаці, пасвілі тады кароў на Жацераўскіх. Быў нас немалы гурт. Чамусьці з'явілася такая звычка трымацца разам. Казалі, што гэта з-за ваўкоў, якіх апошнім часам развялося шмат. Але ваўкоў мы не надта баяліся. Не раз бывала і раней, калі пастушок адзін даглядаў свой статак і раптам з-за кустоў выходзіў воўк. Тут галоўным было моцна крычаць і махаць палкай, якая заўсёды мелася ў руцэ. Ды і каровы адразу ж займалі ваяўнічую пазіцыю — паварочваліся рагамі ў бок драпежніка ды злосна фыркалі. І шэры, як правіла, нехаця адыходзіў. Дарослыя нам гаварылі, што воўк баіцца чалавека. Так што справа тут была не ў ваўках. Нейкая няясная пакуль трывога, што трымалася ў навакольнай прасторы, змушала нас гуртавацца. Вось і тады, як дазналіся, што немцы ўжо ў нашым мястэчку Новы Свержань, вырашылі пакінуць кароў на лузе (дзе яны дзенуцца?) і ісці ў нейкую бліжэйшую вёску. Чаго, каб хто спытаў? Ніхто не адказаў бы. Гнала тая ж дзіцячая і ўжо зусім не дзіцячая трывога. Прыйшлі ў недалёкую Кнотаўшчыну. Немцы сюды яшчэ не заглядалі. Вяскоўцы стаялі купкамі на вуліцы і перагаворваліся, як падалося, зусім спакойна. Што ж, людзі, асабліва старэйшыя, пераменам не здзіўляліся. Мы падыходзілі то да адной купкі, то да другой. Пераканаўшыся, што ніякай бяды не відаць, вярнуліся на луг. Тут якраз прыйшлі жанчыны з вёдрамі падаіць кароў і сказалі, каб мы пачакалі на лузе да вечара. Чаму? «Дзеткі, — гаварыла суседка, — немчуры надта ж многа ў мястэчку, як гразі пасля дажджу. Гергечуць усё па-свойму, а што ў іх у галаве? Ва ўсіх каскі, нібы стаўбуны, насунутыя на вушы». Вечарам, прыгнаўшы кароў, мы ўбачылі, што ўсе вуліцы заняты вайсковай тэхнікай, ледзь нашы рагулі праціснуліся да сваіх падворкаў. Асабліва ўразілі вялізныя тупарылыя аўтамабілі. Праз некалькі дзён тэхнікі не стала, і жыццё, здавалася, пачало ўваходзіць у звыклую каляіну.

Неўзабаве мы сталі знаходзіць у лесе ды прырэчных хмызняках самую розную зброю, найбольш савецкую. Пачалі яе падбіраць: хто б у нашым узросце не хацеў тады пастраляць? Але страшнае слова «расстрэл», што замільгала ў нямецкіх публічных загадах і якое датычыла таксама захоўвання зброі, астудзіла нашы галовы. Праўда, зброя ў гэты самы час, на вялікае наша здзіўленне, апынулася ў руках многіх местачковых хлопцаў. Гэта былі тыя, каго ўзялі ў «службу парадку». Яны не мелі ніякай экіпіроўкі, толькі павязку на рукаве. Але мелі вінтоўку з патронамі. Як мы ім зайздросцілі! Тым больш, што гэтыя ахоўнікі парадку, прынамсі большасць з іх, не так і далёка адышліся ад нас па ўзросце. І мы ўсё круціліся каля іх, каб далі патрымаць вінтоўку ці хаця б дакрануцца да прыклада. А «ахоўнікі», вядома, задзіралі насы перад намі і маглі часам стрэльнуць ні з таго ні з сяго, каб паказаць, якія яны бравыя. Старэйшыя не вельмі яшчэ задумваліся над тым, якая адказнасць узвальваецца на гэтых маладых хлопцаў з вінтоўкамі. Разважалі прыкладна так: парадак патрэбен быў пры Польшчы, пры Саветах, то і цяпер, пры немцах, хай хлопцы парупяцца дзеля сваіх людзей. Нават калі ўжо апранулі яны форму паліцыі, іх вельмі

шанавалі як абаронцаў ад немцаў. І сапраўды, яны стараліся не даваць людзей у крыўду. Мама з жанчынамі не раз хадзіла ў Нясвіж прадаваць яйкі (трэба было неяк жыць). За плечы — карзіну з лямкамі, поўную яек, перасыпаных сечкаю, і — у дарогу. Хаця — няблізкі свет. Але не баяліся. Бо ў Нясвіжы ў паліцыі быў свяржэнскі Алёшка К. Яго так і называлі ўсе — «Алёшка», за вясёлы нораў. Ён, калі што, дапаможа, заступіцца. Алёшку ў мястэчку любілі. Лёс яго, праўда, склаўся як найгорш. У 1944-м, перад самым прыходам Саветаў, ён, пераскокваючы нейкую канаву, зламаў нагу. Што яму зараз заставалася? І Алёшка скончыў з жыццём — выстраліў з пісталета сабе ў падбародак знізу. Хавалі ў сваім мястэчку. Ляжаў у труне, нібы жывы. Толькі пад падбародкам была бачна маленькая круглая папяровая наклейка. Людзей на пахаванні было вельмі многа: землякі яго надта шкадавалі. І ўжо зусім іншую, геройскую вядомасць здабыў паліцэйскі Аляксандр Д., які ў выніку баявой сутычкі трапіў у палон да партызанаў і здолеў адтуль уцячы. Ён быў родам з нейкай бліжэйшай вёскі, але ў Новым Свержні яго зналі: высокі, плячысты, ён кідаўся ў вочы, асабліва пасля сваёй баявой прыгоды. Яго, як распавядаў, пасля допытаў пастанавілі расстраляць. Двое партызанаў павялі выконваць пастанову. Але па дарозе звярнулі ўвагу на яго абутак. «У цябе ж добрыя боты, а табе яны ўжо не спатрэбяцца. Разувайся». Пасадзілі яго, развязалі рукі, звязаныя калючым дротам. Самі селі абапал, з аднаго і з другога боку. Ён паволі сцягнуў адзін бот, затым другі і, не марудзячы, з усёй сілы, якая яшчэ была, ахнуў ботамі па сваіх канваірах. Затым з ботамі ў руках рвануў у лес. Па ім, натуральна, пачалі страляць, але лясны гушчар ды хуткія ногі выратавалі. Гэтая рэдкая гісторыя ўспрымалася, вядома, як шацунак, які жыццё паднесла чалавеку.

Увогуле, жыццё ў мястэчку цякло знешне спакойна, пакуль акупанты не чынілі расправы над яўрэямі. Салдаты з мясцовага гарнізона, асабліва маладыя, часам заходзілі ў хаты і прасілі паесці. Звычайна прасілі малака, яек. Падняўшыся з-за стала, дзякавалі. Праўда, на нашым лесапільным заводзе быў немец Гоер, які біў людзей. Якая ў яго была пасада, невядома, але яго ўсе ведалі, бо хадзіў ён па тэрыторыі з бярозавай палкай і біў ёю кожнага, хто адлыньваў, на яго думку, ад працы. Аднойчы мяне вельмі здзівіў адзін іхні салдат. Было гэта ў суседнім двары, дзе немцы-нарыхтоўшчыкі куплялі бульбу і грузілі яе ў машыну. Я круціўся чагосьці побач. Раптам бачу — адзін з салдат, які заўважыў на недалёкім падворку курэй, прыпёрся да прыгрэбніка і пачаў па іх страляць. «Ненармальны, — падумаў я, — там жа могуць быць людзі». А ці мелі для іх нашы людзі нейкую цану, гэта ў галаву тады не прыходзіла. Неяк маю аднакласніцу Іру Я. цяжка паранілі, калі яны з бацькам зімою ехалі з вёскі і трапілі літаральна пад кулі: побач на полі немцы зладзілі вучэбную стральбу. Праўда, іх вайсковы лекар зрабіў дзяўчынцы аперацыю, і яна паправілася.

Гета з'явілася ў мястэчку даволі хутка. Яно палохала таямнічасцю свайго высокага плота з двума радамі калючага дроту наверсе. Пакідаць сцены гэтага жылля забаранялася. Але ў нас чамусьці гэтая забарона не дзейнічала. І калі я аднойчы цяжка захварэў, канваір прывёў з гета доктара. Прыводзіў, напэўна, не толькі да мяне. Часам хадзілі насельнікі гета па мястэчку, каб абмяняць адзенне ці іншыя рэчы на прадукты. Помню, немец прывёў у наш двор дзяўчыну. Я выбег з хаты і застыў на месцы, не могучы адарваць ад яе вачэй: дзяўчына была незвычайна прыгожай. Запомнілася яе белая, старанна адпрасаваная блузка, на якой былі прымацаваныя мініяцюрнымі шпількамі спераду і ззаду дзве жоўтыя латы, якія павінны былі насіць

яўрэі. Можа, дзякуючы гэтым элегантным шпількам латы не псавалі далікатнага аблічча дзяўчыны. Мама паспела ўжо зрабіць традыцыйны абмен, і дзяўчына трымала ў руках нейкія скрутачкі і торбачку фасолі. Запала ў памяці тая торбачка ў дробную каляровую клетку. Але найбольш тое, што дзяўчына, яшчэ аб нечым размаўляючы з мамай перад адыходам, даставала фасоліны і адну за другой кідала ў рот. «Дзіўная нейкая, — падумаў я, — есць сырую фасолю». Няўцям было тады хлапчуку, што маладая інтэлігентная яўрэйка не магла стрываць голаду.

Знішчэнне людзей, што жылі ў гета, маральна аглушыла. Мы ўпершыню сутыкнуліся з масавым забойствам і адчулі, што акупанты — нелюдзі. І гэта тыя, што заходзілі ў нашу хату, тыя, што ішлі па брукаванай вуліцы мястэчка такім прыгожым строем (побач — афіцэры-элеганты), тыя, што старанна вышчыпвалі каля казармаў лішнюю траўку, выштукоўваючы профіль пешаходнай дарожкі…

Тады бралася на восень. Мы пасвілі кароў насупраць хвойніку. Сядзелі купкаю на Грудзе. Раптам з-за канцавых хат Трайчанаў немцы вывелі групу мужчын — чалавек пятнаццаць. Мы чамусьці адразу зразумелі, што яны з гета. Вялі ў кірунку яўрэйскіх могілкаў, дзе мы нярэдка бывалі, разглядаючы дзівоснай формы надмагільныя помнікі. Неўзабаве там раздаліся стрэлы. Але як было не здзівіцца, калі следам прыгналі кучу людзей, як пасля высветлілася, развітацца з забітымі. З-за сцен могілак паняслося страшнае сваёй эмацыянальнай сілай амаль суцэльнае галашэнне. А мы? Уражаныя гэтым жаночым плачам-крыкам, мы пабеглі паглядзець, нам яшчэ не верылася ў самае горшае. Нашы дзіцячыя яшчэ душы трапяталі ад страху і надзеі на нешта іншае. Я дабег да цэментнай сцяны могілкаў і падскочыў, каб нешта ўбачыць, учапіўшыся пальцамі за яе верхні скошаны край… Сёння я стаю на тым самым месцы. Лета, сонечна, ціха. Могілкі пустыя. Не захаваліся помнікі. Усталяваны, праўда, сціплы жалобна-памятны знак. Сцяна добра збераглася, і яе верхні край дастае мне да грудзей. Думаю аб тым, якім жа я быў маленькім, што стараўся падцягнуцца на руках, каб зірнуць на той бок. Тады я ўсё ж зірнуў, але толькі на імгненне і адразу ж адваліўся назад. Не ад таго, што аслаблі пальцы, а ад жаху ўбачанага. Немцы стралялі кожнаму ў галаву разрыўнымі, відаць, кулямі. І такога лепш не бачыць. Экзекуцыя развітання з пастралянымі людзьмі была, напэўна, разлічана для ўздзеяння на псіхіку тых, хто заставаўся ў гета, каб падавіць іх волю да жыцця.

Пазней пайшлі масавыя расстрэлы, падчас якіх мястэчка заміралa. Помніцца, я з мамай чагосьці апынуліся ў знаёмых, дом якіх выходзіў на цэнтральную вуліцу. І мы доўга ў іх сядзелі, баючыся выйсці. Толькі краем вока назіралі праз акно, як на высокай хуткасці праносяцца вялікія грузавыя машыны, абцягнутыя па версе чорным брызентам. Ішоў 1942 год. Калі гета пусцела, прывозілі новых вязняў. Мужчын строем вадзілі працаваць на лесазавод. І вось адбылася падзея, якая ўскалыхнула ўсё мястэчка. Стаялі тады моцныя маразы. Вартавы на вышцы, што тырчэла на рагу гета, каля рэчкі, не вытрымліваў ноччу холаду і бегаў грэцца на прахадную, дзе была печка. У гета старанна вылічылі гэтыя паўзы ў дзяжурстве, іх рэгулярнасць і працягласць. 29 студзеня 1943 года, падчас такой паўзы, вязні, прыхапіўшы загадзя падрыхтаваныя лесвіцы, каб пераадольваць высокі плот, а таксама ватныя коўдры, якія кідаліся паверх калючага дроту, ірвануліся на волю. Людзей было многа, больш за дзвесце чалавек. Але аперацыя была добра арганізавана і завяршылася хутка. Гэтак жа хутка натоўп пашыбаваў замерзлым рэчышчам Жацераўкі на паўднёва-

ўсходнюю ўскраіну мястэчка. Прайшлі праз алешнік, мінулі могілкі, выйшлі ў поле і дабраліся да лесу. Пагоні не было, і тут спыніліся. Тым больш, што зусім выбіліся з сіл. Паўстала пытанне: а што далей? Лес, які здаваўся выратавальнікам, на цвярозы погляд, добрага не абяцаў. Толькі глыбокі снег, начное бездарожжа, холад, няпэўнасць. Успомнілі, што партызаны, якіх яшчэ трэба знайсці, не вельмі бяруць да сябе яўрэйскае насельніцтва. Было на гэты конт неафіцыйнае распараджэнне з Цэнтра. І многія, асабліва тыя, у каго на руках былі малыя дзеці, засумняваліся, ці адолеюць такі лёс. Узніклі спрэчкі. У выніку частка ўцекачоў — чалавек 80 — вярнулася назад. Немцы іх хутка расстралялі. Астатнія выратаваліся. Мы, хлапчукі, захапіўшыся гэтымі мужнымі ўцёкамі, адразу, таго ж дня пайшлі па слядах натоўпу, нібы далучыўшыся да яго. Скрозь валялася мноства жоўтых латаў, якія людзі зрывалі на хаду з сябе. Ішлі яны па цаліку, і снег быў утаптаны глыбока мноствам ног. Мы доўга стаялі на ўскраіне мястэчка і моўчкі глядзелі на гэтую свежую дарогу жыцця. Мы цешыліся. Яшчэ не зналі, што частка ўцекачоў вярнулася. Калі гета зусім апусцела, старанна пашнырылі па ўсіх кутках пакінутых дамоў, залазілі нават на гарышчы. Чаго мы шукалі? Напэўна, кіраваліся нейкай падсвядомай надзеяй, што хтосьці з жыхароў удала схаваўся і ацалеў.

Партызаны былі далекавата, хаця рэха іх спраў па-рознаму далятала сюды. Сяляне з бліжэйшых вёсак, ратуючы ад партызан сваіх кароў, аддавалі іх у мястэчка сваякам ці знаёмым на часовае ўтрыманне, і нашы пастушковыя статкі прыкметна павялічыліся за гады акупацыі. З мястэчка амаль ніхто не пайшоў у партызаны, бо немцы ведалі жыхароў і маглі знішчыць родных. Яўген Ш. быў сіратою і нікога не падставіў, цішком сышоўшы ў лес. Але зрабіў неўзабаве вельмі неразважлівы крок, і гэта каштавала яму жыцця. Пад восень прыціснулі халады, і ён сярод белага дня прыйшоў у мястэчка да дзядзькі, які жыў на людной Мінскай вуліцы, каб забраць у яго свой шынель. Нешта ў тым шынялі трэба было падрамантаваць, і хлопец сеў з іголкай і ніткаю каля акна, каб бачыць вуліцу. Са зброі меў толькі гранату, якую паклаў перад сабой. Дзядзька замітусіўся па хаце, разумеючы, што сваяк сваім з'яўленнем падпісаў яму прысуд. Таму, доўга не думаючы, пабег з жонкай да немцаў і далажыў пра партызана. Тыя зрэагавалі хутка. Абышлі хату з тыльнага боку і загадалі гаспадару заходзіць першым. І пакуль дзядзька круціў пляменніку рукі, немцы наляцелі і схапілі хлопца.

Балюча мы ўспрынялі таксама гібель двух невядомых партызан, якія спрабавалі падарваць цягнік непадалёк ад Свержня, ды чамусьці падарваліся самі пры закладцы міны. Іх знявечаныя целы ляжалі некалькі дзён ля плота пры ўваходзе на тэрыторыю лесазавода. Вышэй быў прымацаваны пагражальна-выкрывальны тэкст. Ніхто, здаецца, з нас не пайшоў туды паглядзець. Ведалі пра гэта толькі ад дарослых.

Партызаны не хацелі прымаць да сябе чалавека без зброі: а што яму тады рабіць? З другога боку, ці магчыма было тую зброю здабыць? Але гэта як для каго. Былі ў мястэчку два браты — Жорж і Ігар Б. Бацька іх называў паўжартам Чорт і Ідал — такія былі няўрымслівыя. Абодва рудыя, цыбатыя, лоўкія ва ўсім. Старэйшы неяк трапіў на танцы за Нёман, у Акінчыцы. Сюды ж прыйшоў мясцовы паліцэйскі. Сваю вінтоўку паставіў ля печы, у кутку-качарэжніку, і пайшоў танцаваць. Калі танец скончыўся, вінтоўкі на месцы ўжо не было. І як яна знікла, ніхто не бачыў. Так у бліжэйшым лесе стала на аднаго партызана больш.

Урэшце, вайна, якая не стаіць на месцы, прайшла і праз маё мястэчка (пра гэта гл. «На пачатку ліпеня 44-га» // Новы замак. Вып. 4. 2015. С. 72–76), пакінуўшы пажары і разбурэнні. Мужчыны сталі разбіраць нямецкія казармы і з гэтых матэрыялаў ладзілі часовае жыллё. Я тады дапамагаў тату, які спешна ўзводзіў над прыгрэбнікам хатку (назвалі яе «будка»), таксама невялікія хлеў і гумно. Майстры, што панаязджалі тады з Расіі на заробкі, будавалі нам дом. Вельмі цяжка было з харчаваннем. Сякія-такія прадукты здабывалі на вёсцы праз вядомы ўжо абмен. Жыта на полі яшчэ не паспела, і помніцца нясмачная зялёная заціркa для сваіх, бо будаўнікоў трэба было карміць лепшым. Але на такія дробязі не зважалася. Стаяла гарачае сонечнае лета. Мы, хлапчукі-падшпаркі, былі цэлымі днямі з каровамі на лузе каля хвойніку ці на палявых палетках-папарах. Стараліся па магчымасці гуртавацца, тым больш, што з'явіўся вельмі важны супольны інтэрас — зброя. О, сапраўдная вайсковая зброя, якая страляе, выбухае і робіць цябе дужым, дарослым! Яна і небяспечная, рызыкоўная, але тым больш прыцягальная. Як яна гарнула да сябе нашы чулыя да новага, даверлівыя душы. А зброі тады, калі фронт рушыў на Захад, засталося раскіданай вельмі многа. Вінтоўкі, патроны, снарады, гранаты, міны, тол… Збіралася ў нас цэлая гаспадарка, якую хавалі ад чужога вока ў вялікіх і густых кустах. Хадзілі на пашы з вінтоўкамі за спінай, і гэта надавала столькі самастойнасці і ўпэўненасці ў сабе! Вучыліся, і досыць паспяхова, страляць прыцэльна. Не выпадкова я, калі пачаў вучыцца ў БДУ, на першых жа спаборніцтвах па стральбе выканаў нарматыў спартыўнага разраду і насіў на студэнцкай куртачцы — верх светла-шэры, ніжняя частка сіняга колеру — адпаведны значок, што быў прадметам гонару і зайздрасці маіх равеснікаў. Тады ж, у нашы пастушковыя часы мы нярэдка ўзрывалі гранаты — глушылі рыбу ў Нёмане. Зналі, як лаўчэй кідаць якую гранату — лімонку, асколачную, з ручкаю. Калі дома аддаваў маме гатаваць гэтую рыбу, было многа радасці ў тую галодную пару. Праўда, даводзілася, хаваючы вочы, казаць, што глушылі нейкія дзядзькі. Увогуле ж ладзілі мы ўсякія ўзрывы часцей проста так, дзеля пацехі. Падабалася, што самі можам учыніць такі эфект. Бралася толавая шашка, часам немалая, устаўляўся ўзрывальнік, затым — бікфордаў шнур. Яго, праўда, чамусьці было мала, і мы заўсёды шукалі па кустоўі ды ў зарасніках рознага дзікага зелля гэты каштоўны для ўзрываў матэрыял. Таму яго вельмі эканомілі. Устаўлялі кароценькі кавалачак, запальвалі і… Трэба было імгненна сігануць за бліжэйшы куст, легчы і прыціснуць галаву да зямлі, абняўшы яе рукамі. Узрыў бываў такі моцны, што куст проста клаўся на нас, абсыпала нейкім смеццем і літаральна аглушвала — пэўны час мы не чулі адзін аднаго. Пасля аглядалі гэты пашарпаны куст і яму на месцы ўзрыву, якая дымілася і смярдзела, і саміх сябе — вось засталіся ўсе цэлыя і ніводнай драпінкі.

Рызыкаваць азначала для нас дэманстраваць смеласць. Любілі мы, напрыклад, хадзіць па мінным полі, якое паўкругам абыходзіла нямецкія казармы. Хоць немцаў даўно не было, размініраваць гэту тэрыторыю збіраліся надта доўга. І мы паказвалі тут, якія мы зухі. Хадзіць паміж мінаў было складана не толькі з-за небяспекі наступіць на смяротны бугарок зямлі, які ўжо зарос травою, але і таму, што ўсё поле было яшчэ нізка заплецена калючым дротам. Але мы стараліся быць уважлівымі, перадавалі свой «вопыт» іншым, і бяды ні з кім не здаралася. А пахадзіў тут, здаецца, кожны з нас, каб не выглядаць баязліўцам. Да таго ж былі тут і гледачы з нашых, што назіралі здалёк, размясціўшыся за агароджай.

Але легкадумнае абыходжанне са зброяй часам заканчвалася страшным фіналам. Неяк летнім падвячоркам Валодзя Б. сабраўся глушыць рыбу і хадзіў па крутым беразе Нёмана, выбіраючы добрае месца. Мы кучкаю былі на супрацьлеглым беразе. Былі нечым занятыя і не надта зважалі на яго прыгатаванні. Раптам грымнуў узрыў. Мы толькі паспелі заўважыць, што Валодзя ўпаў. Кінуліся адразу ж на той бок. Плылі хутка, нібы спадзяваліся чымсьці яму дапамагчы. Ляжаў ён, выцягнуўшыся на ўвесь свой рост. Боязна было глядзець на тое месца, дзе была галава. Глядзелі на яго босыя ногі, на пальцы, якія яшчэ дробна ўздрыгвалі. Хтосьці з нас ціха, амаль шэптам успомніў: «Ён жа вельмі хацеў пачуць, як шуміць унутры гранаты перад тым, як яе кінуць». У дамавіне ляжаў цалкам закрыты прасціною.

У тым жа 44-м годзе на пашы сталася яшчэ адна трагедыя. Мы тады надта ўпадабалі кулі ад буйнакаліберных зенітных патронаў, якія эфектна загараліся і ўзрываліся, дастаткова было раскалупаць нажом тыльную частку і запаліць. Нават не трэба было падаць на зямлю пры ўзрыве: куля, хоць і шыпела агнём, ляцела далёка, калі добра размахнуцца. Такіх патронаў у нас збіралася чамусьці многа, і мы нярэдка практыкавалі адпаведныя феерверкі. Нават рабілі, дзякуючы гэтай зброі, напады на пастухоў з Мікалаеўшчыны. Справа ў тым, што яны ў выніку канфліктаў з намі заўсёды перамагалі, пускаючы ў ход дубінкі і нават нажы. Цяпер жа нашы буйнакаліберныя патроны, якія ўзрываліся ў паветры, наводзілі на іх паніку. Аднойчы мы нават загналі іх у Нёман і прымусілі надоўга вярнуцца на сваю тэрыторыю. Але выкарыстанне гэтых буйных куляў закончылася ў рэшце рэшт для нас вельмі нечакана. Мы, здаецца, умелі з імі добра разбірацца, Нават быў у нас лідар у веданні зброі і яе скрытых сакрэтаў — Вацік Ф. У той дзень была вельмі патрэбна мая дапамога тату, і я папрасіў падмяніць мяне на пашы суседа, Жэніка А. Вечарам ён распавёў: Вацік рыхтаваў для ўзрыву новую кулю. Гэта была, як быццам, прывычная, звычайная рэч. Вакол стаялі і ўзіраліся сябры-гледачы. І тут куля нечакана разарвалася. Яму адарвала левую кісць рукі, у якой трымаў кулю, адарвала вялікі палец правай рукі, у якой трымаў нож. Працуючы нажом з куляй, ён прыціскаў рукі да жывата, у які прыйшоўся галоўны ўдар. Вацік, які сядзеў, адразу ж падскочыў на калені. Але з жывата пачалі вывальвацца кішкі, і ён адносна ацалелай рукой стаў запіхваць іх на месца. Затым падхапіўся і прабег нейкіх пяць-шэсць крокаў, апусціўся і сказаў апошняе: «Ну. хлопцы, мне ўжо капут». Хлопцаў, што стаялі вакол яго, лёгка параніла фрагментамі яго кісці — пасекла адзенне, рукі, камусьці твар. Малодшы брат Ваціка Коля памчаўся ў мястэчка. Падрыхтавалі падводу і — рыссю туды, на пашу. Паклалі Ваціка на салому і паехалі. Нядоўгую частку дарогі ён яшчэ ледзь чутна стагнаў. Пасля заціх. Сёння, наведваючы сваё роднае мястэчка Новы Свержань, я абавязкова бываю на могілках, дзе засталіся дзеля вечнага спачыну мае бацькі. Стараюся не мінуць магілы Ваціка. Нешта блізкае і балючае чуецца мне ў гісторыі яго кароткага лёсу: я ж павінен быў быць там, побач з ім, сваім сябрам.

Сітуацыя са зброяй мела, зрэшты, не адзін працяг. Тым жа летам, калі пасвілі кароў ля Галавенчыцкага броду, я знайшоў зусім маленькую міну мінамётнага тыпу. Ніколі мы такой не бачылі — даўжынёй з далонь, можа крышку болей, бліскучасрэбранага колеру, нібы з алюмінію. У астатнім звычайная — сперади конусны носік, у канцы — крыльцы. Ну, як цацка. Я адразу ж стаў яе раскручваць: мы зналіся ў мінамётных мінах. Але мая «цацка» ніяк не паддавалася. Побач, ля броду, стаяў слу-

пок — рэштка колішняй агароджы. Стукаў аб гэты слупок, каб неяк раскруціць сваю знаходку. Хлопцы, натуральна, прасілі: пакажы, дай, можа, мы нешта зробім. Але ж гэта была ўжо мая здабыча, і я нікому яе ў рукі не даў. Нарэшце, расчараваўшыся ў ёй, размахнуўся і шпурнуў у Нёман. І тут здарылася поўная нечаканасць. Мая «міна», даляцеўшы да паверхні вады, відаць, ад удару аб яе рванула. Мы ўсе анямелі. Хлопцы, як па камандзе, павярнулі галовы да мяне, і ў іх позірках быў страх і здзіўленне: ты жывы, але ж мог толькі што...

Часта мы практыкаваліся ў стральбе, але не хапала патронаў. Аднойчы выправіліся шукаць на месца нямецкіх казармаў і — дзіва — назбіралі цэлую торбу. Несці торбу вуліцаю не рашыліся. Сеўшы ў нейкую выпадковую лодку, паплылі міма алешніку па возеры. Так называлася тады глыбокая затока на Жацераўцы, каля млына, засланая шырокімі капелюшамі гарлачыкаў. І тут ужо нас чакаў на беразе міліцыянер. Відаць, нехта з зайздроснікаў нашага ж узросту данёс. Патроны былі канфіскаваны, а нас траіх, што былі ў лодцы, пасадзілі пад замок у склеп на бліжэйшай сядзібе, што належала Бельскім. Даволі дзіўна пачуваліся мы ў гэтым зняволенні, дзе праз вялікія дзіркі ў каменных сценах свяціла сонца, а на паліцах стаялі збанкі з малаком, смятанаю, адціскаўся пад прэсам вялікі сыр. Было непрыемна, што нас «пасадзілі». Але боязі не было. Жартавалі наконт таго, каб падсілкавацца і ўвогуле збегчы адсюль. Зрабіць гэта было не так і складана. Але неўзабаве нас выпусцілі, і ніякіх наступстваў наша акцыя па зборы і перавозцы патронаў не мела.

Пра свае баявыя магчымасці апошні раз мы нагадалі ўзрывам у велікодную ноч 45-га года. Вінтовак у нас ужо не было, але ўзрыўчатку яшчэ захоўвалі. Аднекуль даведаліся, што згодна з паганскімі традыцыямі нашы продкі ноччу на Вялікдзень палілі вогнішчы і стралялі, праганяючы злых духаў. Сваё вогнішча мы размясцілі ў кутку цвінтара свяржэнскай царквы, з боку Мінскай вуліцы і падтрымлівалі ўсю ноч. Натуральна, што патрэбна было многа паліва. Мы бегалі па бліжэйшых вуліцах і падворках і стараліся прыхапіць то бярэмя колатых дроў, то прасла плоту, то адзінокую бочку пад паветкай, то туалет. Былі яны тады не толькі драўлянымі, але і саламянымі (з саламяных пляцёнак), што надта прыгожа гарэлі. Драўляныя былі для нас цяжкаватымі. Галоўнае было — паваліць яго на бок. Тады хапалі — па тры хлапчукі з двух бакоў, і дай Бог ногі. Самае вялікае полымя рыхтавалася на хрэсны ход, які рухаўся ў поўнач вакол храма. На гэты ж час прызначылі і выбух. З таго боку царквы, дзе не было паркана, на агародах паклалі трохкілаграмовую шашку толу, прыладзілі апошні з нашых запасаў кавалак бікфордавага шнура. Па сігналу з цвінтара запалілі і кінуліся як мага далей. Выбух быў такой сілы, што людзей літаральна страсянула ўзрыўной хваляй, а ў бліжэйшых хатах вылецелі ў некаторых вокнах шыбы. Пра гэта пасля шмат гаварылі. Казалі, што заведзена крымінальная справа, што нас пачнуць выклікаць на допыты. Але... Усё абышлося. Тады нярэдка здараліся самыя розныя нечаканасці.

Яшчэ ж была ў нашых буднях такая прыемная старонка, як школа. Вучыліся мы ў мясцовай сямігодцы і пры немцах, затым пры Саветах. Праўда, кожны навучальны год моцна ўрэзваўся і залежаў ад сезону пастушковых абавязкаў. Таму мы восенню прыходзілі ў школу позна і вясной пакідалі яе рана. Школа з гэтым мірылася. Тым больш, што настаўнікамі былі тутэйшыя адукаваныя людзі. Яны ўсё разумелі. Я заўсёды стараўся дагнаць упушчанае, і мне гэта ўдавалася. Іншым — таксама. У некато-

рых не атрымлівалася, і яны вымушаны былі пакідаць вучобу. Усё ж заробак пастушка, які хадзіў за сваім статкам нярэдка з пяці-шасцігадовага ўзросту, быў немалым унёскам у сямейны бюджэт.

Падчас акупацыі школа працавала ў самых розных прыстасаваных памяшканнях: у даваенным школьным будынку немцы размясцілі шпіталь і неўзабаве ўчынілі ў ім пажар. Падручнікаў выпускалася мала, і вучні канспектавалі тое, што тлумачыў настаўнік. Замест сшыткаў выкарыстоўвалі любыя абрыўкі чыстай паперы. Адносіны з настаўнікамі былі самымі прыязнымі, бо ўсе яны былі свае — суседзі, добра знаёмыя. Ніякіх прапагандысцкіх імпрэзаў у інтарэсах гітлераўцаў школа не праводзіла. Нават не віселі партрэты іх правадыроў. Моцным быў ва ўсім дух беларускай нацыянальнай ідэі. На ўроках спеваў развучвалі беларускія народныя і кампазітарскія песні. Любімымі песнямі ў нас былі «Яшчэ прыйдзе вясна» (словы Я. Купалы), «У гушчарах, затканых імглою» (словы Н. Арсенневай), «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» (словы М. Краўцова). Беларускія песні выконвалі і вайсковыя адзінкі Беларускай краёвай абароны. Крочыць, напрыклад, па вуліцы мястэчка такая вайсковая калона — і чуецца: «Будзь здаровы бацька, маці, мы пайшлі ўжо ваяваці… Паваюем, пагаруем, зато дома запануем». Мне падабаліся гэтыя маршавыя песні, і я іх запамінаў. Толькі праз многа гадоў даведаўся, што цытаваны тэкст належыць Я. Купалу і ўваходзіць у яго цыкл «Песні на ваяцкі лад», напісаны ў 1919–1920 гадах.

З прыходам Саветаў нас працягвалі вучыць пераважна тыя ж настаўнікі. Прыслалі толькі піянерважатую, што заўсёды насіла чырвоны гальштук, і ваенрука. Мы ўсе актыўна ўдзельнічалі ў правядзенні выбараў у Вярхоўны Савет СССР, савецкіх святаў. На свята Кастрычніцкай рэвалюцыі, напрыклад, я з аднакласнікам Генадзем І. дзяжурылі ноччу ў школе. Адчувалі вялікую адказнасць, і настрой у нас быў баявы. Патрабавалі, каб нам выдалі вінтоўку, якая была ў сельсавеце, цераз вуліцу. Ды з гэтага нічога не атрымалася. Дзяжурыла з намі яшчэ піянерважатая, але яна спала ў настаўніцкім пакоі. У першы ж навучальны год пры Саветах (я быў у 6-м класе) мяне прызначылі старшынёй школьнай грамадскай арганізацыі «Асавіяхім», якая павінна была папулярызаваць ваенна-санітарныя веды і рыхтаваць хлопцаў да войска. Нешта ў гэтым кірунку мы з ваенруком рабілі. Спявалі цяпер у школьным хоры толькі рускія савецкія песні, найбольш франтавыя. Ладзілі невялікай групай вучняў спектаклі, з якімі нават выязджалі на вялікай амерыканскай грузавой машыне («студэбекеры») у суседнія вёскі. Рэпертуар быў цалкам ваенным — беларускія п’есы-аднаактоўкі рэгулярна ў школу дасылаліся.

Адным з любімых настаўнікаў у нашай сямігодцы быў Мікалай Фёдаравіч Г. (праўда, не з мясцовых), які выкладаў гісторыю. Разумны, патрабавальны, справядлівы. Але парадаксальнасць сітуацыі ў тым, што неўзабаве ён быў «выкрыты» і атрымаў 25 гадоў канцлагераў. З цягам часу высветлілася, што ў вайну, пасля таго як партызаны нізавошта забілі яго брата, пайшоў служыць да немцаў. Стварыў мабільную баявую групу (здаецца, на Віцебшчыне), якая наносіла партызанам балючыя і моцныя ўдары. Яго выпадкова пазнала на цяперашнім фотаздымку нейкая зямлячка. Лёс яго згубіўся ў віхуры паваенных драматычных выпрабаванняў.

Жылося ў тыя гады матэрыяльна вельмі цяжка. Туліліся сям’ёй з сямі чалавек у нізенькай хатцы з адным акенцам, якую тата збудаваў над прыгрэбнікам. І як тут было

рыхтаваць урокі? Затое былі ў мяне канькі і самаробныя лыжы. А ад вясны да позняй восені, нягледзячы на тое, што была закінута школа, было ўсцешна на вольным паветры са сваім статкам кароў. Выганім, бывала, вясной на луг — яшчэ гразка ад нядаўняй паводкі, і трава яшчэ вадзяністая. Пераганяем на другі бок Нёмана, на сухое. Вада ў Нёмане яшчэ вялікая. Але каровы прывычна пераадольваюць гэтую перашкоду. А вось цяляты-аднагодкі… Круцяцца, бедныя, па беразе, мэкаюць ад разгубленасці. Тады падбягаеш да такой няўмекі і моцна піхаеш яго ў задок. Ляціць яно потырч у ваду і, падняўшы фантан пырскаў, амаль хаваецца ў ёй. Але тут жа пачынае хутка перабіраць нагамі і плыве, выцягнуўшы кволую шыю. Глядзіш на гэтую малечу і ўсміхаешся: як жа лёгка яна набывае жыццёвы вопыт. Хіба гэта не радасць? А аднойчы вясной спыніліся са статкам на Нізкім востраве, парослым густым дубняком. Што рабіць? Пачалі гуляць «у бандытаў». Крадуся я, нізка згінаючыся, каб не быць заўважаным «праціўнікам». І раптам, вачам не веру, перад носам у мяне — нож з бліскучымі тронкамі. Гэта ж мой! Я яго згубіў мінулым летам і зараз лёгка пазнаю. Крычу ад радасці. Гульня спыняецца. Усе разглядаюць знаходку. Лязо, праўда, спачатку не адкрываецца, крыху прыржавела. Але мацнейшы з нас хлопец спраўляецца з ім. Шыкоўны складны нож! Тата летась выменяў яго ў немца. Я падскокваю ад задавальнення. Пастух без нажа, як без рук. Па-першае, чым выражаш ёмкую роўненькую палачку? А восенню — венікі, мётлы, якімі гаспадыні вымятаюць попел з печы, кашы і кошыкі рознай формы і прызначэння. Усё гэта без нажа не зробіш. Важна яшчэ, каб ён быў і моцны і элеганцкі. Гэты мой якраз адпавядае эталону. Усё жыццё буду помніць тую радасную часіну. Здараліся яны і з іншай нагоды. Што ж, такі ўзрост. Хоць ішла вайна, жорсткая і страшная. Хоць мы зведвалі і горкія страты, мы больш радаваліся і цешыліся. У нас было сонца, Нёман, наш луг і хвойнік, бацькі, сябры, школа. Яшчэ кнігі, якія я вельмі любіў чытаць. Галоўнае ж — у нас было яшчэ ўсё наперадзе.

Аляксей Пяткевіч

нарадзіўся 30 сакавіка 1931 года ў мястэчку Новы Свержань Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. Літаратуразнавец, культуролаг, краязнавец. Кандыдат філалагічных навук. Прафесар. Скончыў філфак БДУ. З 1957 года працуе ў Гродзенскім універсітэце (педінстытуце) імя Я. Купалы. Выдаў кнігі: «Наднёманскія былі» (у сааўт., 1968), «Сюжэт. Кампазіцыя. Характар» (1981), «Гісторыя беларускай літаратуры. XIX — пачатак XX ст.» (у сааўт., 1981, 2-е выд. 1998), «Літаратурная Гродзеншчына. Мясціны. Людзі. Кнігі» (1996), «Маршруты кніжнага слова: з гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне» (2002), «Старонкі спадчыны. Культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з'явы, асобы» (2006), «Музычна-тэатральная культура Беларусі» (X–XVIII стст., 2010), «Слова і кніга Прынёманння» (2016) і інш. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў (1971). Жыве ў Гродне.